# *§ 26–0. Развіццё феадальных адносін у Вялікім Княстве Літоўскім

**Узнікненне буйны́х зямельных уладанняў.** У перыяд Сярэднявечча ў ВКЛ, як і ў іншых краінах Еўропы, зямельная ўласнасць была не толькі эканамічнай асновай асобных феадальных родаў, але і важным фактарам іх палітычнага ўплыву ў дзяржаве. На працягу доўгага часу асноўнай формай феадальнай зямельнай уласнасці была вотчына. Працягвалі існаваць вотчынныя ўладанні, што належалі прадстаўнікам дынастый Рурыкавічаў і Гедымінавічаў. Уладальнікі вотчын, як правіла, мелі княжацкі тытул і ўласных васалаў — вотчынную шляхту, якая за службу сваім сеньёрам атрымлівала ад іх зямельныя рэсурсы.

Умацаванне цэнтральнай улады ў XIV ст. паспрыяла значнаму павелічэнню фонду дзяржаўных зямель за кошт ліквідацыі буйны́х удзельных княстваў. Да сярэдзіны XVI ст. выразнага размежавання паміж дзяржаўнай зямлёй і асабістымі ўладаннямі манарха не існавала. Дзяржаўны зямельны фонд выступаў як найважнейшы рэсурс фарміравання лаяльнасці феадалаў у адносінах да гаспадара. Працэс даравання зямель васалам набыў масавы характар у часы праўлення Вітаўта. Акрамя вотчын, якія існавалі ад старажытнарускіх часоў, у выніку пераразмеркавання дзяржаўнага зямельнага фонду з'явіліся новыя формы зямельнай уласнасці.

Асноўным шляхам фарміравання буйной зямельнай уласнасці ў XIV–XVI стст. былі «выслугі» — дараванні манархам зямлі разам з сялянамі за службу гаспадару. Выслугі даваліся на розных умовах. Дробныя феадалы — шляхціцы — атрымоўвалі выслугі «да жывата», г. зн. на час свайго жыцця і службы ўласніку зямлі. Права распараджэння такой маёмасцю было абмежавана. Буйны́я феадалы, якія адыгрывалі важную ролю

ў вырашэнні дзяржаўных пытанняў, атрымлівалі выслугі «на вечнасць», што давала ім магчымасць перадаваць сваю зямельную ўласнасць у спадчыну. Працэс пажалавання дзяржаўных зямель ішоў даволі хуткімі тэмпамі. У выніку фонд дзяржаўных зямель з XIV да сярэдзіны XVI ст. скараціўся з 80 % да 30 %.

## ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

### Жалаваная грамата караля Жыгімонта I кн. Чартарыйскаму

### (1518 г. снежня 29)

Жикгимонт ... [Т]. Чиним знаменито сим нашим листом.

Бил нам челом наместник пропойский и чечерский кн. Семен Александрович Черторыйский о том, что перво сего дали есмо ему от нас в держание тыи вол. Наши Пропойско и Чычерск, абыхмо его с того не рушали до его жывота, а он слюбил нам в Пропойску замок тамошними людми нашими пропойчичаны и чичераны, а к тому своим накладом збудовати нас ся поднял. Ино коли он его збудуеть, мы з ласки нашое, за таковую его к нам послугу, тыи вол. Наши Пропойско и Чечерск и со всими даньми и доходы, которыи с тых волостей на нас хоживали, даем ему от нас в держанье и не маем его с того рушати до его жывота.

1. *Якія тэрыторыі згадваюцца ў дакуменце?*
2. *У якім статусе знаходзіліся названыя тэрыторыі да звароту князя Сямёна Аляксандравіча Чартарыйскага?*
3. *Якія ўмовы былі пастаўлены перад князем для атрымання зямель у пастаяннае ўладанне?*
4. *Да якога часу князь Чартарыйскі будзе трымаць гэтыя землі?*
5. *Якія гістарычныя падзеі маглі паўплываць на прынянцце рашэння аб перадачы зямель князю Чартарыйскаму?*

Правы феадалаў, калі яны атрымалі выслугі «на вечнасць», рэгуляваліся адпаведнымі прывілеямі. «Вольны ён (феадал) і яго справядлівыя наследкі тое прадаці, замяніці, па душы даці, да свайго пажытачнага, а лепшаму абярнуці, як сам найлепей разумеючы». Буйны́я феадалы — князі і паны — да канца XVI ст. засярodзілі ў сваіх руках значныя зямельныя рэсурсы. Імкнучыся замацаваць іх за

сваімі нашчадкамі, буйны́я феадалы пераўтваралі свае ўладанні ў ардынацыі — зямельныя ўладанні, асноўнымі прынцыпамі якіх з'яўляліся іх неадчужальнасць і непадзельнасць. Пасля смерці ўладальніка ардынацыі яна пераходзіла да старэйшага ў родзе па мужчынскай лініі. Стварэнне з сярэдзіны XVI ст. ардынацый паспрыяла ўмацаванню не толькі эканамічных, але і палітычных пазіцый буйны́х феадалаў і фарміраванню асаблівай іх катэгорыі — магнатаў. У другой палове XVI ст. у ВКЛ налічвалася 29 магнацкіх родаў, якія, складаючы менш за 1 % ад усёй шляхты ВКЛ, валодалі 42,5 % усіх сялянскіх гаспадарак краіны.

Як вы лічыце, ці існавалі адрозненні паміж вотчыннымі землямі і землямі, перададзенымі ва ўладанне феадалаў «на вечнасць»?

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

Магнацкія роды адыгрывалі важную ролю ў палітычным, эканамічным і культурным жыцці Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай. На тэрыторыі сучаснай Беларусі існавала мноства знатных сямействаў, чые імёны ўвайшлі ў гісторыю.

Абярыце адзін з вядомых магнацкіх родаў Вялікага Княства Літоўскага і правядзіце гістарычнае даследаванне.

1. *Даведайцеся, адкуль паходзіць гэты род, якія яго карані, хто былі яго заснавальнікі.*
2. *Назавіце найбольш вядомых прадстаўнікоў роду і іх дасягненні.*
3. *Ацаніце, якую спадчыну пакінуў гэты род і як яна ўплывае на сучаснае грамадства. Прывядзіце прыклады аб'ектаў культурнай спадчыны, звязаных з гэтым родам, што захаваліся да нашага часу.*
4. *Падвядзіце вынікі вашага даследавання, вылучыўшы найбольш значныя моманты ў гісторыі абранага роду і патлумачыўшы, чаму вывучэнне гэтага роду важнае для разумення гістарычнага развіцця краіны.*



Развіццю буйнога землеўладання спрыялі таксама сямейна-шлюбныя сувязі, непасрэднае набыццё зямлі ў іншых шляхціцаў і інш. Адначасова з умацаваннем феадальнай уласнасці на зямлю ішоў працэс

заканадаўчага афармлення і пашырэння падатковага і судовага імунітэту феадалаў. Рост буйнога феадальнага землеўладання істотна паўплываў на сацыяльна-эканамічныя і палітычныя працэсы ў ВКЛ — у прыватнасці, паспрыяў працэсу запрыгоньвання сялянства і фарміраванню саслоўна-прадстаўнічай манархіі.